## РЭЗЮМЭ

Багумінская Ганна Сяргееўна

## Спартыўная інтэрнэт-журналістыка Беларусі

**Ключавыя словы:** спартыўная журналістыка Беларусі, інтэрнэт, інтэрнэт-журналістыка, класіфікацыя спартыўных сайтаў.

**Аб'ект** даследавання – спартыўныя анлайн-СМІ Беларусі, web-рэсурсы дзяржаўных і недзяржаўных грамадскіх арганізацый, спартыўных аб'яднанняў, федэрацый, асацыяцый, саюзаў, сайты традыцыйных спецыялізаваных газет, спартыўныя раздзелы беларускіх інфармацыйных парталаў.

**Прадмет** даследавання – тэндэнцыі, асаблівасці развіцця беларускіх спартыўных анлайн-выданняў і сайтаў, якія асвятляюць розныя віды спорту.

**Мэта** работы – даследаванне стану і асаблівасцей развіцця сучаснай беларускай спартыўнай інтэрнэт-журналістыкі.

**Метадалагічнай базаю** навуковай работы сталі артыкулы, вучэбныя дапаможнікі па тэорыі беларускай і расійскай журналістыкі. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны метад крытычнага аналізу дыскурсу, асноўныя прынцыпы апісальнага метаду, прыёмы кампаратыўнага аналізу.

**Навуковая навізна.** Дыпломная работа з'яўляецца першым спецыяльным даследаваннем спартыўнай інтэрнэт-журналістыкі Беларусі. Даследаванне практычнага вопыту і яго тэарэтычная апрацоўка мае прынцыповае значэнне для абгрунтавання і вызначэння заканамернасцей далейшага развіцця беларускай спартыўнай інтэрнэт-журналістыкі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні дысцыплін журналіскага профілю, падрыхтоўцы спецсемінараў і спецкурсаў па гісторыі журналістыкі, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ